***Сергіевіч С. У.***

# ПРАБЛЕМЫ СУАДНОСІН ЭТЫКІ І ПРАВА Ў ПРАЦАХ У. Д. СПАСОВІЧА

*Сергіевіч Сняжана Уладзіміраўна, студэнтка 3 курса Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, snezhana_sergievich@mail.ru*

*Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Лянцэвіч В. М.*

Уладзімір Данілавіч Спасовіч – найбольш знакаміты сярод юрыстаў прадстаўнік ліберальнай думкі на беларускіх землях у XIX ст., ураджэнец г. Рэчыцы (1829–1906). Як чалавек шматграннага таленту, ён праявіўся таксама ў філасофіі, гісторыі, літаратуразнаўстве, псіхалогіі і публіцыстыцы. Важна адзначыць, што у першую чаргу ён вядомы як крыміналіст, пачынальнік класічнай школы крымінальнага права. У. Д. Спасовіч – аўтар першага ў Расіі падручніка па крымінальнаму праву, прац па крымінальнаму працэсу, а таксама выбітны адвакат.

Адной з першых работ Спасовіча лічыцца курс лекцый “Аб тэорыі судова-крымінальных доказаў у сувязі з судаўладкаваннем і судаводствам”, які быў апублікаваны ў “Часопісе Міністэрства юстыцыі” пасля прадстаўлення гэтага курсу лекцый у Пецярбургскім універсітэце ў 1860 г. Пазней курс быў надрукаваны асобным выданнем.

У сваёй рабоце Спасовіч звярнуўся да аналізу сістэмы фармальных доказаў. Улічваючы недахопы такой сістэмы, ён прапаноўваў прызнаць сукупнасць доказаў як падставу да вынясення судовых рашэнняў па крымінальных справах. Ён заклікаў адыйсці ад фармальнага падыходу да адзнакі паказанняў сведак і пашырэння кругу асоб, якія могуць даваць паказанні. Вучоны выступаў за ўвядзенне ў крымінальным працэсе прынцыпаў галоснасці, вуснасці, спаборнасці судаводства, абгрунтоўваў важнасць удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы і абаронцы. Ужо ў гэтай працы можна прасачыць рысы не только прававых, але і этычных поглядаў юрыста, накіраваныя не толькі на ўдасканаленне судовай сістэмы, але і на забеспячэнне справядлівасці і найбольш дакладнага прызначэння пакарання. Такія ідэі будуць прасочвацца праз усю дзейнасць Уладзіміра Данілавіча.

У 1863 г. быў выдадзены падручнік па крымінальнаму праву, на першых старонках якога аўтар выставіў тэзіс, што ў аснове дзейснаці юрыста павінна быць крытычнасць мыслення, заснаваная на розуме. У сваёй рабоце Спасовіч звяртаецца да паняццяў справядлівасці і годнасці асобы. Ён асуджаў знявагу чалавечай годнасці асуджаных, прычыненне ім маральных і фізічных мучэнняў. Асноўнай мэтай пакарання, па сцвярджэнні аўтара, павінна быць бяспека грамадства, а не помста і застрашэнне асуджанага. Спасовіч быў супраць цялесных пакаранняў і смяротнай кары.

Этычна-прававыя погляды У. Д. Спасовіча можна прааналізаваць таксама з пункту гледжання яго адвакацкай дзейнасці. Пасля сыходу з універсітэта ў знак

пратэсту супраць падаўлення студэнцкіх выступленняў (1861 г.) ён стаў фактычна першым сярод знакамітых адвакатаў, такіх як А. Коні, Ф. Плевако. Асноўным прызначэннем інстытута адвакатуры ён лічыў дапамогу тым, хто звяртаецца да адваката, сваімі ведамі, “вострым словам” і маўленнем. Спасовіч лічыў адным з асноўных прынцыпаў адвакацкай дзейнаці прынцып сумленнага выканання сваіх абавязкаў, незалежна ад таго, ажыццяўляе ён дзейнасць па пагадненні або прызначэнні.

У той жа час вучоны вызначыў прынцып выкарыстання ўласных этычных прынцыпаў пры выбары даручэнняў, якія адвакат на сябе прымае: ён мае права адмовіцца ад ажыццяўлення абароны, калі, напрыклад, даручэнне мае незаконны характар. Такім чынам, адвакат павінен быць разборлівым пры выбары спосабаў для атрымання сродкаў для існавання. Важным прынцыпам дзейнасці адваката з пункту гледжання этычных норм з’яўляецца неразглашэнне звестак, якія складаюць адвакацкую тайну.

У некаторых сваіх прамовах Спасовіч закранае этычныя пытанні дзейнасці адваката ў крымінальным працэсе. Напрыклад, па адной са сваіх справаў ён, гаворачы аб ажыццяўленні абароны па прызначэнні суда, падкрэслівае, што выбар адвакатам сродкаў абароны павінен быць як мага больш добрасумленным, вольным ад выбару кліента. У гэтых сродках не павінны выкарыстоўвацца непацверджаныя доказы, прадстаўленыя кліентам. У сваіх працах, якія асвятляюць дзейнасць адваката, ён падкрэслівае яе грамадскі характар, закліканы служыць шырокім інтарэсам правасуддзя. Такім чынам, па думцы Спасовіча, дзейнасць адваката заснавана не толькі на веданні права і правільным яго прымяненні, але нават у большай ступені на этычных прынцыах.

У аснове ажыццяўлення працы адваката павінна знаходзіцца адчуванне справядлівасці, падыход да працы з разуменнем свайго прызначэння і ўсебаковага даследавання справы.

А. Ф. Коні, аналізуючы прамовы У. Д. Спасовіча, адзначаў, што ім падымаліся пытанні аб свабодзе сумлення, адносінах паміж навукай і рэлігіяй, паміж свабодай веравызнання і свабодай даследавання, аб межах карнай ўлады дзяржавы і аб узаемадзеянні законаў і нораваў, пытанні пра задачы і ўладкаванне суда і пра спосабы і высновы судовага даследавання, аб дзейнасці і арганізацыі суда прысяжных.

Зыходзячы з вышэйсказанага хацелася б адзначыць, што У. Д. Спасовіч зрабіў значны ўнёсак у развіццё крымінальнага права. Прагрэсіўнай і важнай рысай яго дзейнасці ў галіне крымінальнага права было даследаванне суадносін права і этыкі і засяроджванне ўвагі на неабходнасці паралельнага выкарыстання дадзеных рэгулятараў, паколькі толькі такім чынам можна прыйсці да найбольш справядлівага рашэння і ўсталявання бяспекі ў грамадстве.